# ПА ПРЫНЦЫПАХ СТРАТЭГІЧНАГА ПАРТНЁРСТВА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Прэзідэнт Беларусі таксама сустрэўся з першым намеснікам прэм'ера Дзяржаўнага савета КНР Чжанам Гаалі. На гэтай сустрэчы былі акрэслены пытанні, якія Беларусі і Кітаю трэба вырашыць у найбліжэйшай перспектыве.

«У вас цяпер вельмі шмат сяброў. Вы набылі іх зусім нядаўна, калі Кітай стаў адной з уплывовых краін у свеце, фактычна другім пунктам прыцягнення многіх дзяржаў нашай планеты», — адзначыў Прэзідэнт.

«Але ў Беларусі з Кітаем даўняя гісторыя. Уся навейшая гісторыя Беларусі звязана з Кітайскай Народнай Рэспублікай. Гэта значыць, што мы не сітуатыўныя сябры, не сябры ўчарашнія, а даўнія сябры кітайскага народа і паміж намі сапраўды ўстанавіліся вельмі добрыя адносіны», — сказаў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на частату сустрэч кіраўніцтва дзвюх краін. На яго думку, гэта вельмі важна для двухбаковых адносін. «Чым часцей мы будзем сустракацца, тым больш пашыраны будуць нашы адносіны, тым эфектыўней будуць рэалізоўвацца нашы дамоўленасці», — лічыць Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што беларускі бок абсалютна задавальняе сфарміраваная формула перагавораў. «Мы вызначылі адзін аднаго як стратэгічных партнёраў», — падкрэсліў ён.

«Беларусь мы заўсёды лічым надзейным, вялікім сябрам. Мы заўсёды разглядаем вас як свайго жалезнага партнёра», — падкрэсліў Чжан Гаалі. «Пад вашым кіраўніцтвам у Беларусі назіраецца палітычная стабільнасць, развіваецца эканоміка і ўвесь час павялічваецца ўзровень жыцця насельніцтва. Мы захапляемся вашымі дасягненнямі», — дадаў ён. Чжан Гаалі адзначыў, што паміж Беларуссю і Кітаем устаноўлены адносіны ўсебаковага стратэгічнага партнёрства. «І больш за тое, паміж вамі і Старшынёй КНР Сі Цзіньпінам склалася глыбокая асабістая дружба», — сказаў першы намеснік прэм'ера Дзяржсавета, падкрэсліўшы, што трэцяя сустрэча лідараў краін за такі кароткі тэрмін у чатыры месяцы — «гэта вялікая рэдкасць у сусветнай палітыцы».

Умацаванню і развіццю беларуска-кітайскага стратэгічнага ўсебаковага партнёрства заклікана спрыяць і Дырэктыва №5 «Аб развіцці двухбаковых адносін Рэспублікі Беларусь з Кітайскай Народнай Рэспублікай», якую падпісаў беларускі лідар.

**Паводле БЕЛТА.**

# У АБ'ЕКТЫВЕ — КІБЕРЗЛАЧЫНСТВЫ

## У Мінску праходзіць пасяджэнне Савета Міністраў унутраных спраў краін — удзельніц СНД



Фота Надзеі БУЖАН.

**Учора прадстаўнікі дэлегацый усклалі кветкі да манумента Перамогі, а пасля правялі шэраг афіцыйных мерапрыемстваў. Сярод іх — сустрэча з прэм'ер-міністрам Беларусі Андрэем КАБЯКОВЫМ.**

— У парадку дня былі прыярытэтныя пытанні ўзаемадзеяння праваахоўных ведамстваў дзяржаў СНД, — сказаў Канстанцін Шалькевіч, начальнік упраўлення інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС Беларусі. — У прыватнасці, супрацьдзеянне кіберзлачынствам, крадзяжам аўтатранспарту, абарачэнню новых псіхаактыўных, псіхатропных рэчываў і наркатычных сродкаў, а таксама супрацьпраўным дзеянням нефармальных аб'яднанняў спартыўных балельшчыкаў. У рамках форуму таксама адбудзецца шэраг двухбаковых перамоў.

Першая сустрэча міністраў унутраных спраў краін СНД прайшла ў 1992 годзе таксама ў сталіцы Беларусі. Гэтым разам у ёй удзельнічаюць міністры і намеснікі кіраўнікоў ведамстваў Азербайджана, Арменіі, Казахстана, Кыргызстана, Малдовы, Таджыкістана, Беларусі, Расіі і Узбекістана.

**Тарас ШЧЫРЫ.** *taras@zviazda.by*

## ■ Парламенцкі дзённік

# ПАРУШЭННЕ ПРАМЫСЛОВАЙ БЯСПЕКІ БУДЗЕ ДОРАГА КАШТАВАЦЬ

## У Палаце прадстаўнікоў ідзе напружаная праца па падрыхтоўцы адпаведнага законапраекта да другога чытання

**Учора адбылося пашыранае пасяджэнне рабочай групы па падрыхтоўцы праекта закона Рэспублікі Беларусь «Аб прамысловай бяспецы». Узначальвала пошук кансэнсусу член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце і сувязі Вольга ПАЛІЦІКА, якая курыруе падрыхтоўку дакумента да паўторнага разгляду ў Авальнай зале парламента.**

Законапраект паступіў у ніжнюю палату ў лістападзе мінулага года і ў дзень адкрыцця вясновай сесіі 2 красавіка быў разгледжаны ў першым чытанні ў аўтарскай рэдакцыі. Тады намеснік старшыні профільнай камісіі Міхаіл Пачынок інфармаваў калег, што канцэптуальных заўваг па дакументе не паступіла. Аднак з красавіка сітуацыя кардынальна змянілася.

— З таго часу ідзе напружаная праца па падрыхтоўцы дакумента да другога чытання, — паведаміла журналістам дэпутат Вольга Паліціка. — Праект выклікаў вялікі інтарэс не толькі ў дзяржорганаў, але ў першую чаргу — у прадпрыемстваў. Па ініцыятыве дэпутатаў была праведзена рабочая сустрэча з кіраўніцтвам Дэпартамента па наглядзе за бяспечным вядзеннем работ у прамысловасці Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, прадстаўнікамі шэрагу арганізацый нафтахімічнай галіны на базе ААТ «Нафтан». Месца было выбрана невыпадкова, бо гэта прадпрыемства мае шэраг небяспечных вытворчых аб'ектаў. Мы запрасілі да абмеркавання і іншыя буйныя прадпрыемствы, бо выкананне патрабаванняў закона, які рыхтуецца, пацягне працоўныя і матэрыяльныя выдаткі. Напрыклад, прапануецца замацаваць абавязковае страхаванне грамадзянскай адказнасці ў выпадку, калі небяспечны вытворчы аб'ект будзе аднесены да пэўнага тыпу небяспекі. Таму нормы будучага закона разглядаюцца ўсімі зацікаўленымі вельмі пільна, па што сведчыць аб'ём заўваг. Мы ўнеслі шмат паправак, аптымізавалі тэкст законапраекта.

Праца над праектам ускладняецца тым, што яна адбываецца на фоне барацьбы прадпрыемстваў за зніжэнне сабекошту прадукцыі. Пры гэтым паралельна нядаўна быў прыняты Закон аб ахове працы, дзейнічае досыць жорсткае экалагічнае заканадаўства, і калі скласці ўсе патрабаванні названых законаў з патрабаваннямі прамысловай бяспекі, то пра зніжэнне сабекошту казаць становіцца цяжка.

— Таму, працуючы над законапраектам, мы ставім мэту, з аднаго боку, забяспечыць неабходны ўзровень бяспекі не толькі работнікаў прадпрыемства, але ўсяго насельніцтва і навакольнага асяроддзя. З іншага, усе патрабаванні новага закона павінны быць абгрунтаванымі і мэтазгоднымі, — тлумачыць Вольга Паліціка.

Законапраект больш дакладна прапісвае паўнамоцтвы дзяржорганаў і суб'ектаў гаспадарання ў галіне прамысловай бяспекі. Прапануецца ўсе небяспечныя вытворчыя аб'екты да ўводу ў эксплуатацыю ўносіць у адпаведны дзяржаўны рэестр, выключэнне з якога магчыма толькі пасля вываду аб'екта з эксплуатацыі. Гэта дазволіць не страціць небяспечныя аб'екты са сферы кантролю ў выпадку, напрыклад, змены ўладальніка.

Акрамя таго, законапраект больш дакладна прапісвае падыходы да падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне прамысловай бяспекі і праверкі ведаў тых, хто эксплуатуе патэнцыйна небяспечныя аб'екты.

— Дзеючы закон быў прыняты ў 2000 годзе, з таго часу шмат чаго змянілася, — кажа Вольга Паліціка. — У нашай краіне адбываецца мадэрнізацыя прадпрыемстваў, укараняюцца новыя тэхналогіі, усталёўваецца новае абсталяванне, выкарыстоўваюцца новыя сыравінныя матэрыялы. Разам з тым, у некаторых сферах абсталяванне старэе і рызыка здарэнняў павялічваецца. Таму пытанні прамысловай бяспекі, пры ўсёй сваёй тэхнічнай складанасці, не павінны выпадаць са сферы ўвагі заканадаўцаў.

— Па вялікім рахунку, мы кажам пра ўстойлівае развіццё Беларусі: пра тое, каб будучыя пакаленні атрымалі нашу краіну ў стане, не горшым за той, якім карыстаемся мы. Гэта пытанні стратэгічныя. Патрабаванні прамысловай бяспекі будуць стымуляваць нашы суб'екты гаспадарання выкарыстоўваць найбольш бяспечныя тэхналогіі, найбольшую ўвагу надаваць абароне сваіх работнікаў ад уплыву шкодных фактараў. Бо парушэнне нормаў будучага закона будзе не толькі карацца, яно будзе дорага каштаваць, — дадала куратар законапраекта.

Праект закона «Аб прамысловай бяспецы» таксама прадугледжвае спасылку на нарматыўна-прававую базу Еўразійскага эканамічнага саюза.

Дэпутаты спадзяюцца прыняць законапраект у другім чытанні падчас восеньскай сесіі.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА** ■

## ■ Дапамога

# Інавацыя для школьнікаў ад МАЗа

## Банк развіцця плануе прафінансаваць распрацоўку новай мадэлі школьнага аўтобуса

**Учора на тэрыторыі сталічнага акцыянернага таварыства «МАЗ» старшыня праўлення Банка развіцця Рэспублікі Беларусь Сяргей РУМАС прымаў удзел у перадачы 20 школьных аўтобусаў Упраўленням адукацыі Магілёўскага і Брэсцкага абласных выканаўчых камітэтаў, а яшчэ адзін аўтобус будзе накіраваны дзіцячаму дому «Сям'я».**

Увогуле, перадача гэтай тэхнікі ажыццяўляецца ў межах праграмы Банка развіцця «Школьны аўтобус», якая прадугледжвае набыццё на працягу 2013-2017 гадоў не менш як 300 адзінак спецыяльна абсталяваных школьных аўтобусаў за кошт сродкаў банка.

Кіраўніцтва фінансавай установы адзначае, што аўтобусы банк купляе па конкурсе, у якім сёлета перамог МАЗ. Напрыклад, летась частка аўтобусаў, што набыў банк, была расійскай вытворчасці. «Мы разлічваем, што да 1 верасні 2017 года ў конкурсе з боку МАЗа ўжо будуць удзельнічаць новыя мадэлі, якія змогуць добра сябе зарэкамендаваць і на грунтавых пакрыццях у сельскай мясцовасці», — падкрэсліў Сяргей Румас. **Генеральны дырэктар Мінскага аўтамабільнага завода Дзмітрый КАЦЯРЫНІЧ** адзначыў, што сённяшнія мадэлі школьных аўтобусаў былі дадаткова адаптаваны для перавозкі дзяцей. Так, новая мадэль распрацоўваецца спецыяльна для школьнікаў і будзе адрозніваца павышанай прахоАднасцю.

За тры гады Банк развіцця ўжо паставіў больш за 130 аўтобусаў у рэгіёны. Усе 60 аўтобусаў, якія запланавалі на гэты год, будуць перададзены спажыўцам на працягу 1-й паловы верасня. «Сваю працу мы не абмяжоўваем толькі пастаўкай аўтобусаў. Спецыялісты адсочваюць іх эксплуатацыю ва ўсіх рэгіёнах Беларусі. Усе заўвагі, і станоўчыя, і адмоўныя, перадаюцца на МАЗ. Варта адзначыць, што завод да іх прыслухоўваецца і аператыўна ліквідуе недахопы», — патлумачыў пазіцыю банка Сяргей Румас.

Старшыня праўлення Банка развіцця паведаміў, што ў наступным годзе будуць заказаны аўтобусы для дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі. «Такія заяўкі былі ў нас і сёлета, але мы іх не задаволілі. Налета банк плануе паставіць у рэгіёны менавіта такія аўтобусы», — упэўнены Сяргей Румас. Да асноўных перавагаў школьнага аўтобуса сталічнай вытворчасці можна аднесці дадатковыя сістэмы бяспекі для дзяцей і кіроўцы, а таксама прымяненне ў канструкцыі пнеўмападвескі. У салоне размяшчаюцца 22 месцы для сядзення. Усе яны абсталяваны рамянямі бяспекі. На аўтобусе ўсталяваны праблісковыя маячкі, знешняя гучнай сувязь, высоўная прыступка. Тэхніка абсталявана таксама сістэмай абмежавання хуткасці да 60 км/г і пазначана спецыяльным надпісам «Школьны».

Сяргей Румас паведаміў, што айчынны Банк развіцця ў сваёй працы надае вялікую ўвагу палітыцы сацыяльнай адказнасці. Не толькі фінансавыя і інвестыцыйныя, але і спонсарскія праекты банка накіраваны на развіццё эканомікі краіны і павышэнне якасці жыцця яе грамадзян. Ён перакананы, што рэалізацыя праграмы «Школьны аўтобус» дазволіць стварыць умовы для роўнага доступу дзяцей, якія пражываюць у сельскай мясцовасці, да адукацыйных паслуг і будзе спрыяць умацаванню матэрыяльна-тэхнічнай базы сельскіх устаноў адукацыі.

Асобна старшыня праўлення паведаміў, што Банк развіцця выступіў з ініцыятывай прафінансаваць распрацоўку прынцыпова новай мадэлі школьнага аўтобуса. Канструктары МАЗа працуюць над ёй. Прагназуецца, што да вясны 2016 года доследны ўзор такога аўтобуса, які будзе перададзены ў Віцебскую вобласць, будзе гатовы.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by* ■

# ЧАС, КАЛІ МЫ МНОГАЕ ЗДОЛЕЛІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

На адкрыцці прысутнічаў і адзін з аўтараў прадстаўленых на ёй здымкаў — **фатограф Аляксандр ТАЛОЧКА,** які прыйшоў на працу ў БелТА яшчэ ў 1981 годзе.

— Мы патрохту пачынаем забывацца на тое, што было раней, і скардзімся на жыццё, — адзначыў фатограф у гутарцы з журналістамі. — Старэйшае ж пакаленне па-сапраўднаму шануе тое, што ёсць у іх цяпер. За 25 гадоў жыццё беларусаў моцна змянілася, яны сталі больш упэўненымі ў заўтрашнім дні і захацелі жыць яшчэ лепш, што з'яўляецца цалкам натуральным для людзей.

Пасля ўрачыстага адкрыцця выставы там жа, у кінатэатры, прайшлі адкрытыя маладзёжныя дэбаты «Выбірай.by!» на тэму «Як было, і як стала». У дыскусіі прынялі ўдзел студэнты Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце і члены Маладзёжнай палаты 4-га склікання пры Мінскім гарадскім Савеце дэпутатаў.

Моладзь абмеркавала перамены, якія адбыліся ў краіне з моманту атрымання статусу суверэннай дзяржавы, дынаміку развіцця беларускага грамадства, асноўныя дасягненні сучаснай Беларусі.

У якасці незалежных экспертаў выступілі генеральны дырэктар БелТА Дзмітрый Жук, дэпутат Алена Шамаль і першы сакратар ЦК БРСМ Андрэй Белякоў.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

# ІПЧ «ЖЫЛЛЁ» ПРАІНДЭКСАВАЛІ Ў СТАЛІЦЫ

## Цяпер гэтая каштоўная папера наміналам у 1 чэк каштуе амаль 170 тысяч рублёў

Індэкс росту кошту будаўніцтва жылля ў параўнанні з яго цаной на 31 снежня 1991 года для індэксацыі чэкаў «Жыллё» ўстаноўлены ў памеры 169 015,6. Нагадаю, што гаворка ідзе пра выкарыстанне чэкаў «Жыллё» грамадзянамі і членамі іх сем'яў, якія стаяць на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, для аплаты паявога ўзносу ў жыллёвым або жыллёва-будаўнічым кааперативе, фінансавання індывідуальнага або калектыўнага жыллёвага будаўніцтва, рэканструкцыі аднакватэрных блакіраваных жылых дамоў, долевага ўдзелу ў жыллёвым будаўніцтве, набыцця жылля шляхам куплі, а таксама для пагашэння запазычанасці па крэдытах банкаў (уключаючы выплату працэнтаў за карыстанне імі) і пазыках юрыдычных асоб, узятых і выкарыстаных з гэтымі мэтамі.

1 чэк пры разліку будзе прыраўнаваны да 169 015,6 рубля. Прыватызацыйныя чэкі ў розных рэгіёнах каштуюць не аднолькава. Індэкс росту кошту чэкаў «Жыллё» зацвярджаецца самастойна аблвыканкамамі і Мінгарвыканкамам.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*